ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 94 (476-15)+94(438)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-443-449

Паступіў у рэдакцыю 24.04.2018
Received 24.04.2018

**В. І. Крывуць**

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Баранавічы, Беларусь*

## СПАРТЫЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТРАЛЕЦКАГА САЮЗА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920–1930-я гг.)

**Аннотация.** Статья посвящена исследованию такой малоизученной в белорусской исторической науке проблеме, как деятельность Стрелецкого союза «Стрелец» по развитию физической культуры и спорта на территории Западной Беларуси в межвоенный период. Подчеркивается, что уставные документы союза объявляли работу в этой сфере одной из главных задач стрелецкой организации. Также отмечено, что после государственного переворота 1926 г. спортивная деятельность «Стрельца» начала получать всестороннюю поддержку польских властей, которые рассматривали ее в качестве важного компонента своей молодежной политики. Характеризуется проведение спортивной работы в Стрелецком союзе в ходе реализации военной подготовки его членов, а также деятельность стрелецких спортивных клубов и спортивных кружков при отрядах «Стрельца». Анализируется участие западнобелорусских подразделений Стрелецкого союза в подготовке и проведении разного рода спортивных мероприятий как местного, так и общегосударственного масштаба. Сделаны выводы о том, что Стрелецкий союз внес определенный вклад в развитие спорта на территории Западной Беларуси, наибольших успехов при этом добились стрельцы на Полесье и в Вильно. Вместе с тем по ряду объективных причин, прежде всего из-за тяжелого материального положения молодого поколения региона, спортивная деятельность стрелецкой организации не смогла приобрести по-настоящему массовый характер. Использован широкий спектр документальных и зарубежных историографических источников.

**Ключевые слова:** Западная Беларусь, Стрелецкий союз, молодежная политика, спорт, физическое воспитание, межвоенный период

**Для цитирования.** Крывуць, В. І. Спартыўная дзейнасць Стралецкага саюза ў Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.) / В. І. Крывуць // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 4. – С. 443–449. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-443-449

**V. I. Kryvuts**

*Baranovichi State University, Baranavichy, Belarus*

## SPORTING ACTIVITIES OF THE SHOOTING UNION IN WESTERN BELARUS (1920–1930s)

**Abstract.** The article analyzes sporting activities of the Shooting Union «Strelets» in the territory of Western Belarus during the interwar period. The Union's Charter declared the work on the development of physical culture and sports one of the main tasks of the shooting organization. After the coup d'état of 1926, sports activities of the «Strelets» began to receive the full support of the Polish authorities, who viewed it as an important component of their youth policy. The article describes the conduct of sports work in the Shooting Union during the implementation of the military training of its members, as well as the activities of the sports clubs and sports sections in the shooting squads. Participation of the western belarusian units of the Shooting Union in the preparation and conduct of various sports events, both local and national, is analyzed. Conclusions are made that the Shooting Union made a definite contribution to the development of sports in the territory of Western Belarus, the greatest success was achieved by the archers in Polessie and in Vilna. At the same time, for a number of objective reasons, primarily because of the difficult financial situation of the younger generation of the region, sporting activities of the shooting organization were not able to acquire a truly mass character. During the work on the article, a wide range of documentary and foreign historiographic sources was used.

**Keywords:** Western Belarus, Shooting Union, youth policy, sport, physical education, interwar period

**For citation**. Kryvuts V. I. Sporting activities of the Shooting Union in Western Belarus (1920–1930s). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 4, pp. 443–449 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-443-449

Праўрадавыя маладзёжныя арганізацыі з'яўляліся адным з галоўных інструментаў ажыццяўлення афіцыйнай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Найбольш актыўным сярод іх быў Стралецкі саюз «Стралец», які праводзіў даволі шматбаковую дзейнасць у маладзёжным асяроддзі рэгіёна. Адным з кірункаў гэтай дзейнасці з'яўлялася развіццё

© Крывуць В. І., 2019

спорту і фізічнай культуры. На жаль, дадзеная праблематыка не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Што тычыцца польскіх гісторыкаў, то ў іх працах, прысвечаных развіццю спорта на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводстваў міжваеннай польскай дзяржавы, дзейнасць Стралецкага саюза ў гэтай сферы таксама разглядаецца толькі ўскосна [1; 2]. Таму існуе неабходнасць раскрыцця мэт, якія ставіліся перад Стралецкім саюзам у развіцці спорту і фізічнай культуры, метадаў і вынікаў яго працы ў дадзенай сферы. Гэта дазволіць не толькі даць больш падрабязную характарыстыку афіцыйнай польскай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг., але і стварыць больш аб'ектыўнае ўяўленне аб грамадска-палітычным жыцці рэгіёна ў цэлым.

Міжваенны Стралецкі саюз «Стралец» быў створаны ў жніўні 1919 г. і з цягам часу ператварыўся ў адну з самых уплывовых маладзёжных арганізацый праўрадавай арыентацыі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі існавалі дзве акругі «Стральца» – № 3 «Гродна» і № 9 «Палеская», тэрыторыі якіх супадалі з дыслакацыяй вайсковых акруг польскай арміі. Акруга «Гродна» дзялілася на падакругі з цэнтрамі ў Беластоку, Вільні, Гродне і Маладзечне. Акруга «Палеская» мела падакругі «Навагрудак» і «Брэст». Падакругі дзяліліся на паветы і гміны, дзе ствараліся адпаведна павятовыя і гмінныя камендатуры «Стральца» [3, арк. 106].

Дзякуючы актыўнай падтрымцы з боку мясцовых і цэнтральных улад, Стралецкі саюз быў даволі масавым аб'яднаннем. Па ўсёй Польшчы ў 1934 г. ён налічваў 300 000 членаў, з якіх у 3-й і 9-й акругах – каля 50 000 чалавек. Згодна з афіцыйнымі данымі таго часу, стралецкая арганізацыя Віленшчыны з'яўлялася найбольш моцнай ва ўсёй тагачаснай польскай дзяржаве [4, арк. 112]. Членамі «Стральца» на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ў першую чаргу дзеці польскіх чыноўнікаў і асаднікаў, але адначасова прысутнічала і значная колькасць польскіх сялян і беларусаў каталіцкага веравызнання. Напрыклад, у маі 1931 г. на тэрыторыі Баранавіцкага павета беларусы складалі каля 30% мясцовых стральцоў і 15% членаў праўленняў атрадаў саюза [5, с. 356].

Статутныя дакументы «Стральца» абвяшчалі галоўнай задачай яго дзейнасці «памнажэнне якасці і сілы нацыі для развіцця дзяржаўнай моцы Дзяржавы». Гэтага планавалася дасягнуць праз грамадзянскае выхаванне членаў арганізацыі, падрыхтоўку іх да вайсковай службы, а таксама праз фізічнае выхаванне і спорт [6, с. 9]. Што тычыцца апошняга кірунку дзейнасці, то прапаноўваліся наступныя сродкі для яго рэалізацыі:

1) правядзенне спартыўных клубаў, гурткоў і кансультацый, курсаў, заняткаў, лагераў, а таксама спартыўных мерапрыемстваў;

2) удзел у агульнадзяржаўных і міжнародных спартыўных саюзах і аб'яднаннях;

3) будаўніцтва і эксплуатацыя стадыёнаў, спартыўных і гімнастычных пляцовак, басейнаў і розных іншых спартыўных збудаванняў [6, с. 10–11].

Асобным пунктам падкрэслівалася неабходнасць развіцця і прапаганды ў арганізацыі і за яе межамі стралковага спорту [6, с. 10].

Неабходна адзначыць, што падтрымка і развіццё фізічнай культуры і спорту з'яўляліся важнай часткай афіцыйнай маладзёжнай палітыкі, асабліва пасля ўсталявання ў польскай дзяржаве «санацыйнага» рэжыму ў маі 1926 г. Лідар «санацыі» маршал Ю. Пілсудскі лічыў фізічную сілу важным фактарам баяздольнасці арміі. Згодна з яго меркаваннем, задачы ў сферы развіцця фізічнай культуры ўскладаліся не толькі на школу і войска, але і на мясцовае самакіраванне, а таксама на спартыўныя саюзы і грамадскія, у першую чаргу маладзёжныя, арганізацыі [7, с. 111]. У студзені 1927 г. па ініцыятыве Ю. Пілсудскага было створана Дзяржаўнае праўленне фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, якое павінна было кіраваць усімі працамі, звязанымі з усеагульным фізічным выхаваннем і ваенным навучаннем. Акрамя таго, ствараліся ваяводскія, павятовыя і гарадскія камітэты фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі. Яны з'яўляліся органамі, якія ажыццяўлялі супрацоўніцтва дзяржаўных і грамадскіх структур у дадзенай сферы [8, с. 60]. Зразумела, што такое вядучае «санацыйнае» маладзёжнае аб'яднанне, як Стралецкі саюз, не магло заставацца ў баку ад гэтага супрацоўніцтва і павінна было, так ці інакш, разгарнуць спартыўную дзейнасць.

У першую чаргу пэўная фізічная падрыхтоўка членаў «Стральца» адбывалася ў час рэалізацыі галоўнага кірунку яго дзейнасці – ваеннай падрыхтоўкі (ВП). Яна была падзелена на 2 ступені (школа малодшых і старэйшых юнакоў). Праграма кожнай ступені была разлічана на 130 гадзін,

з якіх 35 адводзілася на фізічнае выхаванне. ВП завяршалася ў летніх лагерах, дзе на фізічнае выхаванне прыпадала 30 з прадугледжаных праграмай 105 гадзін [9, арк. 28].

Фізічнае выхаванне ў межах ВП прадугледжвала маршы, бег, кіданне гранаты, элементы фехтавання, спартыўныя гульні (футбол, баскетбол), лёгкую атлетыку, плаванне. Каб атрымаць пасведчанне аб завяршэнні другой ступені ВП, член Стралецкага саюза, акрамя ўсяго іншага, павінен быў мець «Польскую спартыўную адзнаку» і здаць нарматыў па плаванні (25 метраў вольным стылем) [9, арк. 28; 10, с. 7].

Аднак «Стралец» не абмяжоўваўся толькі фізічным выхаваннем сваіх членаў у межах непасрэдна ваеннай падрыхтоўкі. Пры гэтым, як адзначалася на афіцыйным узроўні, пры вырашэнні праблемы фізічнага выхавання і спорту пад увагу браліся такія фактары, як масавасць дадзенага віду спорту, яго прыдатнасць с пункта гледжання навучання, таннасць абсталявання і аб’ектаў, адпаведнасць узросту і полу членаў арганізацыі [11, с. 80]. На тэрыторыі Заходняй Беларусі, акрамя ўсяго іншага, улічваўся і той фактар, што спорт павінен быў садзейнічаць прыцягненню мясцовай беларускай моладзі ў шэрагі «Стральца». Так, згодна з афіцыйнымі справаздачамі, адзначалася, што ў Пінскім, Лунінецкім і Столінскім паветах «сельская моладзь з’яўляецца беларускай і не мае жадання да ваенных заняткаў. Да працы ў ВП яе можна прыцягнуць толькі праз арганізацыю спорту, гульняў і забаў» [12, арк. 59].

Найбольшае распаўсюджанне ў Стралецкім саюзе, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, набылі такія віды, як маршы (паколькі яны не патрабавалі спецыяльнай экіпіроўкі і абсталявання), спартыўныя гульні (баскетбол, валейбол, футбол), водныя віды спорту на чале з плаваннем, бокс, стралковы спорт, лыжны спорт. Ужо ў 1928 г. «Стралец» пачаў праводзіць здачу нарматываў на т. з. «Спартыўную адзнаку Стралецкага союза». Іспыты складаліся з пяці элементаў: бег 100 м, скачкі ў даўжыню, штурханне ядра, стральба з малакалібернай зброі, бег 1 500 м. У 1931 г. менавіта на аснове стралецкай адзнакі была распрацавана і ўведзена агульнадзяржаўная «Польская спартыўная адзнака». Пры гэтым стралецкія нарматывы былі больш складанымі, чым агульнадзяржаўныя [11, с. 81].

Важнымі цэнтрамі спартыўнага жыцця Стралецкага саюза з’яўляліся яго спартыўныя клубы, якія звычайна ствараліся ў гарадах. Напрыклад, у 1931 г. улады афіцыйна зарэгістравалі статут спартыўнага клуба «Стралец» у Брэсце. Задачай клуба абвяшчалася стварэнне ўмоў для працы актыўных спартсменаў і забеспячэнне іх удзелу ў агульнадзяржаўным спартыўным жыцці. Гэта планавалася дасягнуць праз:

1) арганізацыю спорту і гімнастыкі;

2) аказанне дапамогі камендантам Стралецкага саюза пры правядзенні спартыўнай працы і арганізацыі гурткоў у атрадах «Стральца»;

3) папулярызацыю спорту сярод шырокіх мас моладзі, у першую чаргу сярод членаў стралецкай арганізацыі;

4) удзел у агульнадзяржаўным спартыўным жыцці [13, с. 2].

З мэтай выканання сваіх задач клуб атрымліваў права мець свае спартыўныя пляцоўкі; праводзіць гімнастычныя і спартыўныя заняткі; арганізоўваць спаборніцтвы і гульні; ствараць спартыўныя гурткі моладзі; праводзіць спартыўную прапаганду; удзельнічаць у агульнадзяржаўных спартыўных саюзах [13, с. 2–3].

Кіруючымі органамі клуба лічыліся агульны сход і праўленне на чале са старшынёй. Фінансавы кантроль ажыццяўляла рэвізійная камісія [13, с. 7]. Для кіраўніцтва асобнымі відамі спартыўнай дзейнасці маглі стварацца спецыяльныя секцыі. Фонды клуба фарміраваліся за кошт членскіх узносаў (0,5 злотых штомесячна ад аднаго члена), даходаў ад платных мерапрыемстваў, добраахвотных ахвяраванняў, падарункаў, датацый і г. д. [13, с. 13–14]. Аднак на практыцы аснову фінансавання складала дапамога ад дзяржаўных структур, у першую чаргу ад Дзяржаўнага праўлення фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўкі, а таксама ад яго ваяводскіх, павятовых і гарадскіх структур – камітэтаў фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі. Пэўную дапамогу развіццю спорту ў Стралецкім саюзе таксама аказвала Войска Польскае.

У Заходняй Беларусі найбольш актыўна спартыўныя клубы Стралецкага саюза ствараліся на тэрыторыі падакругі «Брэст». У сярэдзіне 1930-х гг. тут існавала 8 павятовых спартыўных клубаў

«Стралец» [14, с. 63]. Што тычыцца іншых падакруг, то на сённяшні дзень вядома толькі пра існаванне спартыўных клубаў у Лідзе і Вільні [1, с. 317]. Тым не менш адсутнасць клубаў не перашкаджала спартыўнай дзейнасці «Стральца», якая развівалася за кошт розных спартыўных гурткоў, існаваўшых непасрэдна пры асобных атрадах стралецкай арганізацыі.

Члены гэтых гурткоў ужо з першай паловы 1920-х гг. актыўна ўдзельнічалі ў розных спартыўных спаборніцтвах мясцовага, рэгіянальнага і нават агульнадзяржаўнага ўзроўню. Так, 27 – 28 верасня 1923 г. у Брэсце адбыліся акруговыя спаборніцтвы, арганізаваныя камандаваннем вайсковай акругі № 9 «Брэст над Бугам». У іх прынялі ўдзел 149 чалавек з Брэста, Седлец, Лукава, Слоніма, Бяла-Падляскі і Баранавіч. Найбольш масава быў прадстаўлены менавіта Стралецкі саюз – 13 яго атрадаў выставілі 114 чалавек. Таксама ў спаборніцтвах удзельнічалі прадстаўнікі Гімнастычнага таварыства «Сокал», Саюза сельскай моладзі і Спартыўнае таварыства са Слоніма. У праграму спаборніцтваў уваходзілі ваенна-спартыўнае пяцібор’е, індывідуальная стральба, лёгкая атлетыка і футбол. Па выніках спаборніцтваў лідарам стала каманда Стралецкага саюза з Лукава, якая ўзяла 5 першых, 6 другіх і 3 трэціх месца ў асобных відах. Другое месца занялі стральцы з Брэста – 3 першых, 3 другіх і 4 трэціх месцаў. Трэцяе месца занялі седлецкія стральцы – 1 першае і 3 другіх месцы. Пры гэтым афіцыйная справаздача адзначала, што дасягненні лепшых атлетаў брэсцкіх спаборніцтваў адстаюць нават ад сярэдніх добрых паказчыкаў па ўсёй краіне. Такі вынік тлумачыўся цяжкімі ўмовамі, у якіх працуюць арганізацыі, – недахопам пляцовак, спартыўнага абсталявання і прафесійных кіраўнікоў у невялікіх мястэчках і вялікіх вёсках, адсутнасцю разумення з боку грамадства і мясцовых улад [15, с. 19–21].

Сітуацыя пачала выразна мяняцца пасля 1926 г. Гэта адбілася на выніках спартыўнай дзейнасці стралецкіх арганізацый Заходняй Беларусі. Так, ужо ў 1928 г. нешматлікая віленская каманда «Стральца» заняла першае месца на агульнапольскіх спаборніцтвах саюза па стральбе ў Варшаве [16, с. 3].

Адначасова ў другой палове 1920-х гг. усё большую папулярнасць сярод стралецкіх спартсменаў стаў набываць маршавы спорт. Першым значным маршавым спаборніцтвам стаў «Марш шляхам Кадруўкі». Упершыню ён быў арганізаваны Стралецкім саюзам у 1924 г. у 10-ю гадавіну выступлення 1-й кадравай роты Легіёнаў Пілсудскага 6 жніўня 1914 г. Потым гэты марш адбываўся штогадова па маршруце Кракаў – Кельце (120 км) на працягу трох дзён – з 6 па 8 жніўня. Акрамя ўсяго іншага, гэтым мерапрыемствам «Стралец» ушаноўваў «гістарычны подзвіг Будаўніка Польшчы і свайго найвышэйшага пратэктара маршала Юзэфа Пілсудскага» [17, с. 5]. Стралецкія каманды з Заходняй Беларусі ўпершыню прынялі ўдзел у «Маршы шляхам Кадруўкі» ў 1926 г. – разам з 66 іншымі стралецкімі камандамі ў спаборніцтве ўдзельнічалі каманды з Гродна і Вільні. Праўда, неабходна адзначыць, што віленская каманда не здолела прайсці маршрут у поўным складзе і яе дыскваліфікавалі [18, с. 9; 19, с. 193]. У далейшым удзел заходнебеларускіх стральцоў у маршы стаў рэгулярным.

Падобныя маршы пачалі праводзіцца і непасрэдна на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так, у 1927 г. тут адбыліся «Майскі марш» па маршруце Беласток – Гродна (82 км), марш «Свіцязянскі шлях» Баранавічы – Навагрудак (58 км). У 1928 г. упершыню правялі «Надбужанскі марш» па маршруце Бяла – Брэст (44 км), «Марш шляхам Баторыя» Канстанцінаў – Вільня (86 км). Апошні з іх быў арганізаваны Віленскім ваяводскім камітэтам фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, арганізатарам усіх астатніх з’яўляўся Стралецкі саюз [17, с. 5].

Маршавыя спаборніцтвы з’яўляліся важнымі падзеямі ў мясцовым спартыўным жыцці. У якасці прыкладу можна прывесці «Свіцязянскі шлях», мэтай якога было ўшанаванне 1-й кадравай роты і праверка фізічнай спраўнасці войска і арганізацый ВП [20, с. 3]. Першы марш адбыўся 5 – 6 жніўня 1927 г. Усяго ў ім прынялі ўдзел 13 каманд: стралецкія дружыны з Навагрудка, Слоніма, Сталовіч (веска Баранавіцкага павета), Новаельні, Баранавіч, Ліды, Міра, Дзятлава, вайсковыя каманды 78-га і 79-га пяхотных палкоў, 20-га палка палявой артылерыі, каманда батальёна Корпуса аховы пагранічча са Стоўбцаў і дружына Пажарнай стражы з Навагрудка [21, с. 6]. У афіцыйнай справаздачы адзначалася, што многія атрады «Стральца» з сельскай мясцовасці падакругі «Навагрудак» не здолелі прыняць удзел у маршы, паколькі іх члены займаліся сельскагаспадарчымі працамі ў полі. Пераможцам першага «Свіцязянскага шляху» стала каманда

78-га пяхотнага палка, другое месца занялі стральцы з Навагрудка, трэцяе – 79-ы пяхотны полк [22, с. 8–9].

Другі «Свіцязянскі шлях» адбыўся 21–22 ліпеня 1928 г. На гэты раз у ім прынялі ўдзел 23 каманды: 11 стралецкіх (у тым ліку 4 жаночыя), 7 вайсковых, 4 каманды Пажарнай стражы і 1 паліцэйская. Як паказалі вынікі спаборніцтва, узровень фізічнай падрыхтоўкі ў Войску Польскім быў вышэйшы, чым у Стралецкім саюзе. Першае месца заняла каманда 42-га пяхотнага палка з Беластока (дарэчы, у 1927 г. яна перамагла ў «Маршы шляхам Кадруўкі»). Другое і трэцяе месца занялі адпаведна 78-ы пяхотны полк з Баранавіч і 77-ы пяхотны полк з Ліды [23, с. 28–30].

Трэці «Свіцязянскі шлях» адбыўся 13–14 верасня 1930 г. У ім прынялі ўдзел 19 каманд. Улічваючы папярэдні вопыт, іх падзялі на тры асобныя катэгоры: армейскія, стралецкія, каманды іншых арганізацый. Кожная катэгорыя спаборнічала асобна. Лідарам сярод дружын Стралецкага саюза стала каманда з Бяла-Падляскі [24, с. 2]. На жаль, трэці «Свіцязянскі шлях» стаў апошнім. Па фінансавых прычынах, звязаных с наступствамі эканамічнага крызісу, мерапрыемства перастала праводзіцца.

Зразумела, што эканамічны крызіс, які пагоршыў і без таго складанае эканамічнае становішча Заходняй Беларусі, адмоўна адбіўся на развіцці спартыўнага жыцця. Тым не менш Стралецкі саюз працягваў сваю дзейнасць у спартыўнай сферы, галоўным чынам праз развіццё спартыўных гурткоў пры сваіх атрадах. Найбольшую актыўнасць у гэтым кірунку «Стралец» праяўляў на Палессі. Згодна з афіцыйнымі данымі, у сярэдзіне 1930-х гг. пры мясцовых атрадах аб’яднання дзейнічала 1 769 спартыўных гурткоў. На розных інструктарскіх спартыўных курсах штогадова навучалася каля 200 стральцоў. У 1933/34 навучальным годзе «Польскую спартыўную адзнаку» атрымалі 2 489 мясцовых стральцоў, а ў 1935/36 навучальным годзе – 3 247 [14, с. 63]. Паказальна, што ў пачатку 1930-х гг. Брэст нават займаў другое месца па колькасці гэтых адзнак сярод польскіх гарадоў (адносна колькасці жыхароў) [2, с. 136].

У другой палове 1930-х гг. афіцыйныя справаздачы адзначалі «добра зразумелае кіраванне масавым спортам» палескіх стральцоў, што пэўным чынам кампенсавала адсутнасць нейкіх выдатных спартыўных рэкордаў. Так, у 1937 г. на Палессі Стралецкі саюз правёў 61 лыжны паход, 53 веласіпедныя рэйды, 263 турыстычныя паходы, 27 водных рэйдаў (вяслярных, парусных, на байдарках). Акрамя таго, была праведзена веласіпедная эстафета ад савецкай граніцы (Мікашэвічы) праз паветы: Лунінец, Пінск, Драгічын, Кобрын, Косава, Пружаны, Бельск-Падляскі, Седльце, Лукаў, Радзынь-Падляскі, Бяла-Падляска, Влодава, Брэст (агульная працягласць 860 км). У гэтым мерапрыемстве, якое мела спартыўна-турыстычны і прапагандысцкі характар, прынялі ўдзел 20 каманд, а таксама 390 індывідуальных удзельнікаў, стральцоў і членаў іншых арганізацый. Таксама на мясцовым узроўні (ваяводства, павет, горад, гміна) быў праведзены шэраг камандных спаборніцтваў па асобных відах спорту: 58 баскетбольных, 605 валейбольных, 17 па боксу, 66 футбольных, 178 па лёгкай атлетыцы, 14 хакейных, 13 веласіпедных, 205 па настольным тэнісе, 3 па лыжнаму спорту, 10 па водных відах спорту (вяслярныя, байдарачныя, парусныя), а таксама 25 маршаў [25, с. 15].

Больш сціплымі былі спартыўныя дасягненні стральцоў у іншых акругах і падакругах на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стралецкая прэса прызнавала, што, за выключэннем віленскага Спартыўнага клуба Стралецкага саюза, спартыўная дзейнасць арганізацыі не выйшла за лакальныя межы, хаця, улічваючы цяжкія мясцовыя ўмовы, у гэтай сферы робіцца шмат [26, с. 13]. Віленскі спартыўны клуб «Стральца», секцыі якога ўваходзілі ў склад агульнадзяржаўных спартыўных федэрацый Польшчы, займаў высокія месцы ў класіфікацыі, праведзенай Галоўнай камендатурай арганізацыі [27, с. 108]. З 1935 г. на Віленшчыне рэгулярна праводзіўся лыжны марш Зулаў – Вільня, які з цягам часу набыў маштаб агульнадзяржаўнага спартыўнага мерапрыемства. Актыўны ўдзел у яго арганізацыі і правядзенні прымалі і мясцовыя стралецкія структуры [1, с. 324]. Што тычыцца Навагрудчыны, то гэта наогул быў слаба развіты ў спартыўным плане рэгіён Заходняй Беларусі [1, с. 327]. Пра гэта сведчыла і статыстыка Стралецкага саюза. Напрыклад, у 1936 г. мясцовыя стралецкія структуры правялі 24 спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы. Акрамя таго, праводзіліся спаборніцтвы па вяслярнаму спорту, 440 юнакоў і дзяўчат прынялі ўдзел у баскетбольных спаборніцтвах. Пры гэтым кіраўніцтва «Стральца» спасылалася на камуніка-

цыйныя цяжкасці і аддаленасць ад асноўных кіруючых органаў, што перашкаджала нармальнаму развіццю, у тым ліку і спартыўнай працы [28, с. 94].

Такім чынам, у 1920 – 1930-х гг. Стралецкі саюз «Стралец» у ходзе рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі праводзіў значную спартыўную дзейнасць сярод моладзі Заходняй Беларусі. Згодна са статутнымі дакументамі «Стральца», гэтая дзейнасць лічылася адным з асноўных кірункаў працы дадзенага аб'яднання. Яна актывізавалася пасля 1926 г. і ў першую чаргу праводзілася ў рамках ваеннай падрыхтоўкі маладога пакалення. Таксама пэўную працу вялі стралецкія клубы і спартыўныя гурткі пры мясцовых стралецкіх атрадах. Стралецкія структуры Заходняй Беларусі прымалі ўдзел у арганізацыі і правядзенні рознага роду спартыўных мерапрыемстваў як рэгіянальнага, так і агульнадзяржаўнага маштабу. Найбольшую актыўнасць у спартыўнай сферы Стралецкі саюз праяўляў на Палессі і ў Вільні. Тым не менш неабходна адзначыць, што наступствы эканамічнага крызісу і наогул цяжкае матэрыяльнае становішча заходнебеларускіх ваяводстваў сталі сур'ёзнай перашкодай для развіцця спартыўнай дзейнасці «Стральца» ў рэгіёне. На працягу ўсяго міжваеннага перыяду яна так і не набыла сапраўды масавага характару і не здолела ахапіць шырокіх колаў заходнебеларускай моладзі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Małolepszy, E. Przyczynek do dziejów sportu ludności polskiej województw północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / E. Małolepszy // Przegląd Polsko-Polonijny. – 2012. – № 3. – S. 313–328.

2. Małolepszy, E. Kultura fizyczna i turystyka w województwie poleskim w latach 1921–1939. Zarys problematyki / E. Małolepszy, T. Drozdek-Małolepsza // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2014. – № 41. – S. 126–142.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242 п. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. Воп. 1. Спр. 483.

4. НАРБ. – Ф. 242 п. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. Воп. 1. Спр. 465.

5. Bogalecki, T. Związek Strzelecki wobec słowiańskich mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej / T. Bogalecki // Przegląd Historyczny. – 1995. – № 3–4. – S. 351–359.

6. Statut i regulaminy Związku Strzeleckiego. – Warszawa: Wydawnictwo Centralnego Instytutu Wydawniczego Związku Strzeleckiego, 1933. – 178 s.

7. Jabłonowski, M. Wychowanie fizyczne i przysposobienie wojskowe w opiniach Józefa Piłsudskiego 1926–1935 (wybrane zagadnienia) / M. Jabłonowski // Echa Przeszłości VI. – Olsztyn, 2005. – S. 107–118.

8. Dziemianko, Z. Przysposobienie wojskowe Związku Strzeleckiego w latach 1919–1939 / Z. Dziemianko // Przegląd Naukowo-Metodyczny. Edukacja dla Bezpieczeństwa. – 2009. – № 2. – S. 57–63.

9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 67 сч. Камандаванне акругі карпусоў № 9. – Воп. 2. – Спр. 197.

10. Tymczasowy program przysposobienia wojskowego w szkolach średnich, zawodowych i seminarjach nauczycielskich // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1923. – № 1. – S. 7–9.

11. Kurleto, M. Wychowanie fizyczne w Związku Strzeleckim / M. Kurleto // Strzelec. – 1933. – № 53. – S. 80–82.

12. ДАБВ. – Ф. 59 оц. Папячыцельства Брэсцкай школьнай акругі. – Воп. 2 оц. – Спр. 1052.

13. Statut Brzeskiego klubu sportowego "Strzelec". – Brześć: Drukarnia Literacka, 1931. – 16 s.

14. Cichowicz, C. Jak pracuje Okręg Brześć nad Bugiem / C. Cichowicz // Strzelec. – 1936. – № 50–52. – S. 62–64.

15. Kawalec, T. Okręgowe zawody sportowo-strzeleckie organizacji P.W. w Brześciu n/B. / T. Kawalec // Strzelec. – 1924. – № 19 – 20. – S. 19–22.

16. Ze związku Strzeleckiego // Kurjer Wileński. – 1928. – 13 października. – S. 3.

17. Wiśniewski, K. O sporcie pieszym / K. Wiśniewski // Stadjon. – 1929. – № 24. – S. 5.

18. Czaki, T. Trzeci Marsz Szlakiem Kadrówki / T. Czaki // Strzelec. – 1926. – № 31–33. – S. 4–19.

19. V-ty Marsz Szlakiem Kadrówki 6. VIII. 1928. – Warszawa: Drukarnia Państwowa, 1928. – 244 s.

20. Regulamin Marszu Strzeleckiego „Szlakiem Świteziańskim" Baranowicze – Nowogródek. – Nowogródek: Drukarnia Wydziału Pow. w Nowogródku, 1930. – 16 s.

21. Kronika // Życie Nowogródzkie. – 1927. – № 13. – 6 sierpnia. – S. 6.

22. Przebieg Marszu Szlakiem Świteziańskim // Życie Nowogródzkie. – 1927. – № 14. – S. 7–9.

23. Drugi Marsz Szlakiem Świteziańskim // Strzelec. – 1928. – № 31–32. – S. 28–30.

24. III Marsz Szlakiem Świteziańskim // Życie Nowogródzkie. – 1930. – 14 września. – S. 2.

25. Kurleto, M. Z życia sportowego okręgów Związku Strzeleckiego w r. 1937 / M. Kurleto // Strzelec. – 1938. – № 2. – S. 15–16.

26. Kurleto, M. Z życia sportowego okręgów Związku Strzeleckiego w r. 1937 / M. Kurleto // Strzelec. – 1938. – № 3. – S. 12–13.

27. Strzelcy na ziemi Komendanta // Strzelec. – 1936. – № 50 – 52. – S. 105–109.

28. Gajl-Kot, A. Na pograniczu Rzeczypospolitej / A. Gajl-Kot // Strzelec. – 1936. – № 50–52. – S. 93–95.

## References

1. Małolepszy E. Przyczynek do dziejów sportu ludności polskiej województw północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej [*A contribution to the history of sport to the population of Polish north-eastern provinces of the Second Polish Republic*]. Przegląd Polsko-Polonijny [*The Poland – Polonia Review*], 2012, no. 3, pp. 313–328.

2. Małolepszy E., Drozdek-Małolepsza T. Kultura fizyczna i turystyka w województwie poleskim w latach 1921 – 1939. Zarys problematyki [*Physical culture and tourism in the Polesie province in the years 1921 – 1939. Outline of the problem*]. Białoruskie Zeszyty Historyczne [*Belarusian Historical Journals*], 2014, no. 41, pp. 126–142.

3. Natsional'nyj archive Respubliki Belarus' (NARB) [*National Archive of the Republic of Belarus (NARB)*]. F. 242 p. L. 1. C. 483.

4. NARB [*NARB*]. F. 242 p. L. 1. C. 465.

5. Bogalecki T. Związek Strzelecki wobec słowiańskich mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej [*Shooting Union against Slavic national minorities in the Second Polish Republic*]. Przegląd Historyczny [*Historical Review*], 1995, no. 3–4, pp. 351 – 359.

6. Statut i regulaminy Związku Strzeleckiego [*Statute and regulations of the Shooting Union*]. Warshaw, 1933, 178 p.

7. Jabłonowski M. Wychowanie fizyczne i przysposobienie wojskowe w opiniach Józefa Piłsudskiego 1926–1935 (wybrane zagadnienia) [*Physical education and military training in the opinions of Jozef Pilsudski 1926–1935 (selected issues)*]. Echa Przeszłości VI [*Echoes of the Past VI*]. Olsztyn, 2005, pp. 107–118.

8. Dziemianko Z. Przysposobienie wojskowe Związku Strzeleckiego w latach 1919–1939 [*Military disposition of the Shooting Union in the years 1919 – 1939*]. Przegląd Naukowo-Metodyczny. Edukacja dla Bezpieczeństwa [*Scientific and Methodological Review. Education for safety*], 2009, no 2. pp. 57–63.

9. Gosudarstwennyj arkhiv Brestskoj oblasti (GABO) [*State Archives of Brest Region (SABR)*]. F. 67 sch. L. 2. C. 197.

10. Tymczasowy program przysposobienia wojskowego w szkolach średnich, zawodowych i seminarjach nauczycielskich [*Provisional program of military training in secondary schools, vocational and teacher training seminars*]. *Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego = Official Journal of the Ministry of Religion and Public Education,* 1923, no. 1, pp. 7–9.

11. Kurleto M. Wychowanie fizyczne w Związku Strzeleckim [*Physical education in the Shooting Union*]. *Strzelec = Archer,* 1933, no. 53, pp. 80–82.

12. GABO [*SABR*]. F. 59 oc. L. 2 oc. C. 1052.

13. Statut Brzeskiego klubu sportowego "Strzelec" [*Statute of Brest sports club „Strzelec"*]. Brest, 1931, 16 p.

14. Cichowicz C. Jak pracuje Okręg Brześć nad Bugiem [*How the Brest on the Bug district works*]. *Strzelec = Archer,* 1936, no. 50 – 52, pp. 62 – 64.

15. Kawalec, T. Okręgowe zawody sportowo-strzeleckie organizacji P. W. w Brześciu n/B. [*District sports and shooting competition of the M. T. organizations in Brest*]. *Strzelec = Archer,* 1924, no. 19–20, pp. 19–22.

16. Ze związku Strzeleckiego [*From the Shooting Union*]. *Kurjer Wileński = Wilno Kurier,* 1928, no. 235, p. 3.

17. Wiśniewski K. O sporcie pieszym [*About walking sport*]. *Stadjon = Stadium,* 1929, no. 24, p. 5.

18. Czaki T. Trzeci Marsz Szlakiem Kadrówki [*Third March along the Kadrówka Trail*]. *Strzelec = Archer,* 1926, no. 31–33, pp. 4 – 19.

19. V-ty Marsz Szlakiem Kadrówki 6. VIII. 1928. [*V-th March along the Kadrówka Trail 6. VIII. 1928.*]. Warshaw, 1928, 244 p.

20. Regulamin Marszu Strzeleckiego "Szlakiem Świteziańskim" Baranowicze – Nowogródek [*Regulations of the Marching Rifle «Svityazan Trail» Baranowicze – Novogrudok*]. Novogrudok, 1930, 16 p.

21. Kronika [*Chronicle*]. *Życie Nowogródzkie = Nowogródek life,* 1927, no. 13, p. 6.

22. Przebieg Marszu Szlakiem Świteziańskim [*The route of the March along the Svityazan Trail*]. *Życie Nowogródzkie = Nowogródek life,* 1927, no. 14, pp. 7–9.

23. Drugi Marsz Szlakiem Świteziańskim [*Second March on the Svityazan Trail*]. *Strzelec = Archer,* 1928, no. 31–32, pp. 28–30.

24. III Marsz Szlakiem Świteziańskim [*III March along the Svityazan Trail*]. *Życie Nowogródzkie = Nowogródek life,* 1930, no. 215, p. 2.

25. Kurleto M. Z życia sportowego okręgów Związku Strzeleckiego w r. 1937 [*From the sporting life of the Shooting Union District in 1937*]. *Strzelec = Archer,* 1938, no. 2, pp. 15–16.

26. Kurleto M. Z życia sportowego okręgów Związku Strzeleckiego w r. 1937 [*From the sporting life of the Shooting Union District in 1937*]. *Strzelec = Archer,* 1938, no. 3, pp. 12–13.

27. Strzelcy na ziemi Komendanta [*Archers on the Commander's land*]. *Strzelec = Archer,* 1936, no. 50 – 52, pp. 105–109.

28. Gajl-Kot A. Na pograniczu Rzeczypospolitej [*On the border of the Republic*]. *Strzelec = Archer,* 1936, no. 50–52, pp. 93–95.

## Информация об авторе

**Кривуть Виталий Иванович** – кандидат исторических наук, доцент. Барановичский государственный университет (ул. Войкова, 21, 225404, Барановичи, Республика Беларусь). E-mail: krivut@mail.ru

## Information about the author

**Vitaly I. Kryvuts** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor. Baranovichi State University (21 Voikova Str., Baranavichy 225404, Belarus). E-mail: krivut@mail.ru